**Г. А. ЯБЛОНСКАЯ,**
настаўніца ДУА «Любушанскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа» Бярэзінскага раёна

# ПРАЎДА ЖЫЦЦЯ Ў ТВОРЫ ЯКУБА КОЛАСА «ХМАРКА»

## (урок у VIII класе)

**Мэта:** дапамагчы вучням асэнсаваць ідэйны змест казкі; яе патрыятычны пафас.

**Задачы:** раскрыць адметнасць Коласавых «Казак жыцця», якая заключаецца ў алегарычнасці, спалучэнні казачнага і рэальнага; паказаць мастацка-філасофскую скіраванасць аўтарскай думкі; выявіць ролю пейзажу ў творы; развіваць творчыя здольнасці вучняў, лагічнасць іх мыслення, вуснае маналагічнае маўленне; выхоўваць пачуццё любові да роднай зямлі і гаспадарскія адносіны да яе.

**Абсталяванне:** інтэрактыўная дошка, партрэт Якуба Коласа, сцэнічныя касцюмы Хмаркі, Скалы, Арла, Бусла і старога Дуба.

**Эпіграф:**

Не шукай ты шчасця, долі
На чужым, далёкім полі.
*Янка Купала.*

### Ход урока

На інтэрактыўнай дошцы — маленькі белы камячок Хмаркі на фоне высокага сіняга неба.

**I. Уступнае слова настаўніка.**

Настаўнік.

Прыгожая белая Хмарка
Па сініх нябёсах плыве,
Ў бяскрайнія светлыя далі
Яна за сабою заве.

Напэўна, такая ўжо чалавечая натура: кліча яго нязведанае, невядомае. Міжволі наш позірк часта прываблівае сіне-блакітнае неба, дзе плывуць удалячынь прыгожыя белыя аблокі ці хмаркі.

Больш за стагоддзе таму сачылі гэтак жа прагна за імі і цікаўныя, дапытлівыя вочы Костуся (будучага паэта Якуба Коласа), які любіў бавіць час на ўлонні прыроды.

- А кім быў яго бацька? *(Бацька служыў лесніком у Радзівілаў.)*
- Давайце згадаем сапраўднае імя і прозвішча Якуба Коласа. *(Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.)*
- Як вы думаеце, з якога твора Якуба Коласа наступныя радкі:

«А гэтыя хмурынкі! Хто іх ведае: адкуль яны выпаўзаюць і куды ідуць яны так згодненька, такія мілыя ды прыветныя. От узяў бы ды сеў на іх і паплыў бы разам з імі, каб толькі далей быць адгэтуль».

**Для падказкі:** казка «Крыніца»; «Песняляснога жаваранка» (урывак з трылогіі «На ростанях»); апавяданне «Дзеравеншчына».

- Як нарадзілася на свет і адкуль узялася белая прыгожая хмарка?

**II. Праверка дамашняга задання.**

Вучням трэба было падрыхтаваць «тонкія» і «тоўстыя» пытанні, якія датычацца летняй раніцы, калі нарадзілася Хмарка. Асобным вучням даецца індывідуальнае заданне падрыхтавацца да інсцэніроўкі двух эпізодаў твора. У час праверкі дамашняга задання на інтэрактыўнай дошцы паступова ўзнікаюць вобразы твора.

**Прыкладныя «тонкія» пытанні да твора**

- Які час сутак быў, калі нарадзілася Хмарка? Якая пара года? *(На інтэрактыўнай дошцы з'яўляецца сонейка з яркімі промнямі.)*
- Хто спяваў на круглым лісціку лотаці? *(Пры адказе вучняў на інтэрактыўнай дошцы з'яўляюцца два конікі на круглым лісціку лотаці.)*
- Якая птушка трашчала на ўвесь луг? *(На інтэрактыўнай дошцы з'яўляецца сіваронка.)*

- З кім яна сварылася? *(На інтэрактыўнай дошцы бачны цыбаты бусел.)*
- З каго цешыўся бусел? *(На інтэрактыўнай дошцы з'яўляюцца маленькія буслянияты ў гняздзе.)*
- Хто жалобна пішчэў у небе? *(На інтэрактыўнай дошцы з'яўляецца каршун.)*
- Дзе ў гэты час быў вецер? *(Вецер спаў аж да паўдня.)*

**Прыкладныя «тоўстыя» пытанні да твора**

- Чаму не можа быць шчаслівы той, хто не ведае свайго роду? *(Прыкладны адказ: чалавек не можа быць шчаслівым, калі ён не ведае сваіх каранёў, бацькі і маці, сваёй роднай зямлі. Беспрытульны і бязродны чалавек ніколі не зможа стаць шчаслівым.)*
- Чаму нас вабяць да сябе незнаёмыя далі? *(Прыкладны адказ: нам хочацца зазірнуць за далягляд, зразумець, што там. Новы свет поўны для нас адкрыццяў, яны робяць наша жыццё разнастайным, але адкрыцці могуць быць і непрыемнымі. Гэта ўзбагачае наш жыццёвы вопыт.)*
- Дзе лепш за ўсё жыць чалавеку на свеце? *(Прыкладны адказ: лепш за ўсё жыць дома, на роднай зямлі, дзе табе ўсё знаёма і цябе ўсе добра ведаюць, могуць дапамагчы ў цяжкую хвіліну. Дома і сцены дапамагаюць. Змораны конь шпарчэй дадому бяжыць.)*

На інтэрактыўнай дошцы дэманструецца малюнак летняй раніцы.

**III. Творчыя заданні.**

**1.** Выпішыце крылатыя выразы з тэксту і дайце ім сваё тлумачэнне, перабудаваўшы выказванне з ужываннем антонімаў.

**Прыкладныя варыянты выкананай працы**

«Можа, затым яна і была такая шчаслівая, што нічога не ведала аб белым свеце». — Нешчаслівы той, хто шмат ведае аб белым свеце.

«Зблізку ўсё з'яўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе, бо такая ўжо натура і схільнасць нашай душы — бачыць усё добрае і прыгожае ў тым, што далёка ад нас, што не з намі». — Зблізку ўсё з'яўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе, бо такая ўжо натура і схільнасць нашай душы — бачыць усё дрэннае і агіднае, што блізка, што з намі.

«Уласнае шчасце бязроднай Хмаркі не давала ёй мажлівасці прыкмеціць чужое гора». — Уласнае няшчасце бязроднай Хмаркі давала ёй мажлівасць прыкмеціць чужое гора.

«Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы». — Хто сам няшчасны, таму здаецца, што і ўсе няшчасныя.

«У сваім родным кутку работы досыць для кожнага». — На чужыне не хапае працы для ўсіх.

**2.** На інтэрактыўнай дошцы складзіце карту падарожжа бязроднай Хмаркі.

**Карта падарожжа Хмаркі**

Радзіма — чужыя далі — халодны край — пустэлі — мора — Радзіма.

**3.** Пакажыце інсцэніроўку гутаркі Хмаркі, Скалы і Арла.

## Інсцэніроўка

Тонкая і маленькая Хмарка прытулілася да Скалы.

Скала *(пытаецца ў Хмаркі)*. Адкуль прыпаўзла, нябога?

Хмарка. Не ведаю *(боязна)*.

Скала. Што робіш, чым займаешся?

Хмарка прысядае і робіцца яшчэ меншай.
Яна спалохана маўчыць.

Скала. Я люблю паслухаць, што робіцца на свеце. Што ж ты бачыла, раскажы мне.

Хмарка асмелілася і пачала з захапленнем гаварыць.

Хмарка. На зямлі так хораша, так цудоўна! Пада мною плывуць палі з пясчанымі схіламі ўзгоркаў, зялёныя лугі з пакручастымі стужкамі бліскучай вады, адвечныя бары-лясы. Усе там шчаслівыя і радасныя. А як спяваюць мошкі, конікі, травы, збажына!

Арол *(уступае ў гутарку)*. Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы. Быў і я ў тых краях, адкуль прыблуталася імасць. Там, гаворыш, — шчасце? А што ж, па-твойму, няшчасце? Там палі выплакалі апошнія слёзы, каб даць табе жыццё, шчаслівая Хмарка! І цяпер там нават расы не бывае. Але не для таго назначаліся слёзы, каб радзіць цябе на свет для бадзяння па чужых краях…

Заплакала бедная Хмарка, і выправілася яна ў дарогу.

**Праблемнае пытанне.** Чаму заплакала Хмарка над роднай зямлёй халоднымі слязьмі? *(Прыкладны адказ: Хмарка заплакала таму, што доўга бадзялася па свеце, не шкадуючы пажоўклае жыта, круглы лісток лотаці, на якім спявалі два прыўдалыя конікі. Яна не думала пра тых, хто быў для яе дарагім і блізкім, і прынесла ім шмат болю і пакут. Хмарка зразумела сваю віну, калі яе віталі пажоўклыя палі, пагарэлая збажына. Яе слёзы ўжо не маглі выратаваць іх, але яны трапілі на родную зямлю і, пэўна ж, спатрэбяцца ёй.)*

**4.** Паказ міні-інсцэніроўкі гутаркі старога Дуба і Бусла і яе абмеркаванне.

**Інсцэніроўка**

Павесялелы стары Дуб звяртаецца да Бусла.

Стары Дуб. От навука для тваіх дзяцей. Моцна ж накажы ты ім, дружа, каб не лёталі дарэмна па свеце, не бадзяліся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнага.

Бусел маўчыць і глядзіць удалячынь. Відаць, ён іначай разумее гэтую з'яву, а можа, і не дачуў ён слоў свайго сябра.

**Праблемнае пытанне.** Як іначай мог глядзець на гэту справу Бусел? *(Прыкладны адказ: буслы кожны год вымушаны ляцець у вырай, каб не загінуць сцюдзёнай зімой на радзіме. Яны бачаць іншыя землі, багатыя і ўрадлівыя, але кожнай новай вясной птушкі вяртаюцца на сваю Радзіму. І таму пісьменнік Уладзімір Караткевіч паэтычна назваў нашу Беларусь... Зямлёй пад белымі крыламі.)*

Настаўнік. Да нас сёння завітала ў госці каманда эрудытаў пачатковых класаў, па добрай школьнай традыцыі яна называецца «Буслікі». Паслухаем іх меркаванне наконт гутаркі Бусла і старога Дуба.

Каманда «Буслікі».

Белыя буслікі к вам прыляцелі,
У Афрыку з мамай ляцець не хацелі:
Што там, у Афрыцы, спёка ды Ніл,
Так і глядзі, каб не з'еў кракадзіл.
А ў Любушанах хапае турбот:
Вунь як ад жабак надзьмуўся жывот.
Трэба і поплаў, і сад абхадзіць.
І на Радзіме люба нам жыць.

**Праблемнае пытанне.** Ці згодны вы з меркаваннем «буслікаў»? Якая яна, Буслава праўда? *(Прыкладны адказ: безумоўна, калі б у птушак была магчымасць перазімаваць на роднай зямлі, яны не ляцелі б у далёкую і небяспечную дарогу. Птушак гоняць у вырай моцныя халады, лютыя маразы, адсутнасць корму. Яны вымушаны шукаць выратавання на чужыне. Маленькія «буслікі» пакуль не разумеюць гэтага, яны таксама адправяцца з бацькамі ў вялікую вандроўку. Але тут іх родныя гнёздоўі, светлыя берагі дзяцінства, і Радзіма будзе сніцца ім за марамі-акіянамі і будзе, як зорка, вабіць да сябе.)*

**IV. Музычная паўза.**

Гучыць песня на словы Алеся Ставера (музыка Ігара Лучанка) «Жураўлі на Палессе ляцяць» (выконвае трыа дзяўчынак).

**Праблемнае пытанне.** Ці згодны вы з меркаваннем Янкі Купалы, што не трэба шукаць сваё шчасце на чужыне? Калі так, то чаму? *(Прыкладны адказ: так, усюды добра, а дома лепш. Тут усё знаёма да драбніц. Тут побач бацькі, сваякі, сябры, суседзі. Тут і сонейка свеціць асабліва пяшчотна. Толькі на Радзіме чалавек можа быць шчаслівым.)*

**V. Творчая работа.**

Складанне сінквейна па тэме ўрока.

**Узор выкананага задання**

**Радзіма**

Любая, дарагая.
Гадуе, песціць, акрыляе.
Назаўсёды.
Маці, Зямля пад белымі крыламі.

**VI. Рэфлексія ў форме невялікага эсэ.**

Вучням па варыянтах прапануюцца прыказкі пра родную зямлю. Трэба асэнсаваць іх на матэрыяле твора і напісаць міні-эсэ (невялікае сачыненне-разважанне) — да 8—10 сказаў.

**Прыказкі для напісання эсэ**

Чужая старонка пірагамі не накорміць.
Дзе нарадзіўся — там і згадзіўся.
Родная старонка — маці, чужая старонка — мачаха.
Кожная сасна свайму бору песню спявае.

**Прыклады эсэ**

**«Чужая старонка пірагамі не накорміць»**

Бязродная Хмарка доўга блукала па чужых землях і адчувала сябе шчаслівай. Яна не ведала праўды жыцця, не разумела, што яе чакаюць пасохлыя палі і збажына. У чужых краях яе апанаваў востры холад і жах. Яна нікому там не была патрэбная. А на роднай зямлі яе чакалі бедныя каласкі і пакрыўджаныя конікі, што славілі нараджэнне Хмаркі. Няшчасная і сумная Хмарка вярнулася з чужых краёў на Радзіму.

**«Дзе нарадзіўся — там і згадзіўся»**

Бязродная Хмарка не думала аб тым, што яна таксама недзе нарадзілася, што ў яе ёсць адказнасць перад палямі, якія выплакалі апошнія слёзы, каб даць ёй жыццё. Яна не знайшла сабе прытулку на чужыне. Добра, што свабодалюбівы Арол расказаў ёй праўду жыцця.

Хмарка, адчуваючы вялікую віну перад засохлымі палеткамі, вярнулася на Радзіму. Яна заплакала халоднымі слязьмі над роднымі палямі. Гэтыя Хмарчыны слёзы хоць крыху ажывілі зямлю і вярнулі надзею на ўраджай.

**«Родная старонка — маці, чужая старонка — мачаха»**

Хмарка пакінула родную старонку. Яна шчаслівая, як майская раніца, блукала па свеце. Але нязведаныя далі ахінулі нарэшце Хмарку холадам і жахам. Чужая старонка не сагрэла Хмарку і не паспачувала ёй. Бедная Хмарка вярнулася на Радзіму. І хоць яна заплакала на роднай зямлі халоднымі слязьмі, мы разумеем, што тут яна адшукае сваю долю і сваё шчасце.

**«Кожная сасна свайму бору песню спявае»**

Сасна вырасла ў сваім бары. Удзячная, яна будзе спяваць песню менавіта свайму бору, што гадаваў яе і жывіў. Апошнія слёзы палі выплакалі, каб нарадзіць Хмарку. Хмарка не адразу зразумела, што яна патрэбная роднай зямлі. Яна вярнулася з чужыны, каб праліць халодныя слёзы на роднай зямлі. Гэта яе песня, праўда, пакуль што невясёлая. Напэўна, з цягам часу Хмарка будзе спяваць вясёлыя песні сваёй Радзіме.

**VII. Дамашняе заданне.** Скласці крыжаванку па прачытаных творах Якуба Коласа.

На інтэрактыўнай дошцы з'яўляецца маленькі белы камячок Хмаркі.